ГУ «Минская районная центральная библиотека»

# Их имена навечно в памяти односельчан

# БАЧИЛО ЛЕОНИД АНДРЕЕВИЧ



Михановичи, 2024

**«Их имена навечно в памяти односельчан. Бачило Леонид Андреевич»** [Текст]: Информационный бюллетень / сост. М.Камлюк; худ.- оф. М.Камлюк; ГУ «Минская районная центральная библиотека». – Михановичи. — 2024. — 13 с.

Предназначен для массового читателя.





**Бачило Леонид Андреевич (Афанасьевич) (1889-1942)**

**Бачыла Леанід Андрэевіч (1889-1942)**

Леонид Адреевич родился 18 августа 1899 года в деревне Бордиловка Кайковского сельского совета.

Бачило Леонид Андреевич (Афанасьевич) - секретарь Кайковского с/с с 1934 г. по 1942 г. активный участник подпольной борьбы в годы Великой Отечественной войны. Родился в 1889 г. в д. Бордиловка Кайковского сельского Совета. В 1918 году работал кочегаром и помощником машиниста на паровозе, на железнодорожном участке Петроград – Дно, затем в Белоруссии.

В 1930 году был активным организатором колхоза «Рассвет» и счетоводом колхоза.

С 1934 года секретарь Кайковского сельсовета, бессменный депутат Кайковского сельсовета, политрук запаса, с 1937 года по совместительству вёл военно-учетный стол сельсовета. Аккуратный, всгда по-военному подтянутый, дисциплинированный, пользовался авторитетом среди населения, а также работников Минского РК КПБ и райисполкома. Часто бывал в колхозах с совхозах района, выступал перед коллективами об опыте организации калхозов и мерах по улучшению их работы.

Жил Бачило Л.А. с женой Агафией Кирилловной 1905г. рождения и двоими детьми: сыном Леонидом 1927г. рождения, дочкой Софьей 1929г. рождения.

С 1940 года кандидат ВКП (Б). В 1941 году по рекомендации РКП, председателя с/с Бортника П.И., Бачило Л.А. переехал на станцию Михановичи. Между шоссейной дорогой и болотным массивом пробили новую

улицу, где Бачило построил новый дом (после войны этой улице присвоено имя Бачило Л.А.).




Война заставила 30 июня 1941 года Бачило Леонида уехать с документами с/совета на восток, попал в окружение, уничтожил документы, был вынужден вернуться назад. Под руководством партийно-комсомольской подпольной организации «Победа», действовавшей на территории Дукорского, Пережерского, Кайковского сельских советов и города Минска и члена Минского коммунистического подполья, временно исполняющего обязанности секретаря Минского подпольного райкома партии Калиновского Арсения Викентьевича перешел на подпольную борьбу с немецко-фашистскими захватчиками. Немцы принудительного использовали его в качестве грузчика торфа, отправляемого с торфозавода Михановичи и Минск для электростанций.

Во время войны Бачило собирал для вооруженной борьбы оружие, боеприпасы, распространял листовки

среди населения и военнопленных рабочих, работающих на торфозаводе. Дезорганизует работу по добыче торфа, бросая «случайно» корчи, которые машину ломают, похищал и засыпал песок в горюче-смазочные материалы, чем сорвал двухсменную работу по добыче и вывозке торфа. Устраивал побеги военнопленным, отдельных прятал у себя дома, а затем перенаправлял в партизаны, засыпал песок в буксы железнодорожных вагонов, на станции. Организовывал срывы и перебои в отправке торфа, через военнопленных, работающих на торфозаводе.

Осенью 1941 г., группа подрывников подпольной организации «Победа» во главе с Олейником А. М. с участием Бачило Л. А., Казея И. И. и других заложили взрывчатку-мину. В результате был подорван вражеский эшелон с бензином, идущий на Восточный фронт.



Мужчины с улицы Бачило

Три железнодорожные платформы груженные 200 литровыми бочками слетели с путей. Вспыхнул бензин, огромное пламя бушевало всю ночь. Это была удача, сутки не ходили вражеские эшелоны. Целый день под холодным проливным дождём, последним в 1941 году перед морозами, фрицы растаскивали с железнодорожного полотна изуродованные огнём вагоны и бочки. А в чёрных

мундирах гитлеровские служаки из полиции безопасности СД пытались с собаками найти следы советских патриотов – исполнителей воли народа. Но это не удалось, дождь смыл следы.

В конце 1941 года на станцию Михановичи со стороны станции Седча прибыл и стоял более суток железнодорожный эшелон с советскими военнопленными. Плохо одетые, изнуренные люди лежали ослабевшие, полузамёрзшие на голом полу открытых платформах-углярках. Попытки улучшить в какой-то мере положение военнопленных или местных жителей, проживающих возле станции, подать одежду, солому или еду, подавлялись со звериной жестокостью. С тамбурных построек, где сидели в овчинных тулупах охранники безжалостно и безразборно сыпались пулеметно-автоматные очереди, по умирающим людям, освещая свой кровавый путь прожекторами. Некоторые не выдерживали, снимали шинели, рубахи, обувь, отдавали своим товарищам, а сами шли на самоубийство – бросаясь полураздетые под дула пулемётов.

После ухода «Эшелона смерти» в сторону станции Колядичи на путях осталось девятнадцать советских граждан, примерзших в собственной крови к земле. Их, безымянных, ломами отдолбили и похоронили на станции у железнодорожной бани.

Только кавалеристу, лейтенанту советской Армии удалось убежать, его встретил Бачило Л.А., первые слова лейтенанта «Ради Бога, помогите согреться». Но задерживаться на станции не захотел. Его обогрели, накормили и проводили в Алексеевский лес.

Леонид Андреевич устанавливал тесные контакты с коммунистами, комсомольцами и другими патриотами сельсовета, приобщал их к активной подпольной работе, рекомендовал отдельных в партизаны. Немцы никак не могли напасть на след подпольщиков, вынуждены были увеличить гарнизон на станции Михановичи, усить охрану объектов и железной дороги. Бачило выдал предатель.

Тихим морозным утром 22 января 1942 года на станции Михановичи произошла трагедия. Фашисты в доме инженера торфозавода Камлюка схватили подпольщика-фельдшера Казея И.И., куда он пришёл к больному ребёнку. Убили хозяина и подпольщика, дом сожгли. Тоже самое произошло и в доме Бачило Л.А.

Сюда привели начальника почтового отделения Струпцова Антона, Связали руки обоим, закрыли в доме и сожгли.

Так в жестокой борьбе с фашизмом на станции Михановичи партийно-комсомольское подполье потеряло троих своих бойцов. Секретаря с/с Бачило Леонида Афанасьевича и начальника почтового отделения Струповца Антона.

Сожжен живым Бачило Л.А. 22 января 1942 г. в собственном доме.




Схема кровавого следа фашистских убийц на железнодорожной станции Михановичи, Кайковского сельского совета Минской области.



У памятной доски на улице Леонида Бачилы










З партызанскага дзённіка

# СТАРОНКІ МУЖНАСЦІ

**Гэтыя нататкі не прэтэндуюць на поўнату асвятлення цяжкай, багатай драматычнымі падзеямі партызанскай барацьбы. Хіба можна вычарпаць у вузкіх газетных рамках гераічныя будні народных мсціўцаў? Я ставіў перад сабой сціплую задачу — прасачыць лёс адной партызанскай сям'і. Лёс, што быў характэрны для многіх савецкіх грамадзян, якія апынуліся на часова акупіраванай тэрыторыі і ўсімі даступнымі ім сродкамі змагаліся супраць ненавіснага ворага.**

**1941 год. Канец жніўня.** ...

...

Пасля вайны я сустрэў Валю і Мітрафана. ... Памяць аб Сцяпане і Зоі Буравых для іх, як і для ўсіх нас, — незабыўная.

**А. АЛЕЙНІК,**
**намеснік дырэктара лабараторыі ... праблем АН БССР, былы камандзір партызанскага атрада імя Калініна.**

Мінская праўда 4 стар.
3 верасня 1968 г.

“Гэтыя нататкі не прытэндуюць на паўнату асвятлення цяжкай, багатай драматычнымі паддзеямі партызанскай барацьбы. Хіба можна вычарпаць у вузкіх газетных рамках гераічныя будні народных мсціўцаў? Я ставіў перад сабой сціплую задачу – прасачыць лес адной партызанскай сям'і. Лёс, што быў характэрны для многіх савецкіх грамадзян, якія апынуліся на часова акупіраванай тэрыторыі і ўсімі даступнымі ім сродкамі змагаліся супраць ненавіснага ворага.

1941 год. Канец жніўня. Нарэшце, адбылася доўгачаканая сустрэча з патрыётамі вёсак Кайкава, Бардзілаўка, станцыі Міханавічы. Прывёў сюды мяне і майго сябра Мікалая Дудніка, з якім мы трапілі ў акружэнне і цяпер хаваліся ў Кайкаўскім лесе, камуніст Аляксей Бельскі. Ён – жыхар Бардзілаўкі, былы дзясятнік участка торфапрадпрыемства “Міханавічы”. Пазнаёміліся з ім праз дзядзьку Пятра Сачка. Выдатныя людзі гэтыя два Пятры – Сачок і Кухарэка. Каб не яны, невядома, што было б з намі, двума чырвонаармейцамі. Яны забяспечалі нас не толькі ежай, але і пажыткамі духоўнымі, прымаючы радыёперадачы з Масквы. Ад іх мы даведаліся аб закліку партыі ствараць невыносныя ўмовы для ворага на акупіраванай тэрыторыі, арганізаваць усенародную партызанскую барацьбу. Гэта, дарэчы, і стала зместам першай лістоўкі, якую мы выпусцілі неўзабаве. Яе, як мы даведаліся потым, распаўсюджвалі мясцовы фельчар Казей, бухгалтар торфапрадпрыемства Сцяпан Бураў і былы сакратар кайкаўскага сельсавета камуніст **Леанід Апанасавіч Бачыла**. Вось з імі ўсімі мы сустрэліся на кармакухні бардзілаўскага калгаса, цяпер ператворанай у шпіталь для ваеннапалонных і жыхароў вёскі. Немцы сюды не саваліся – баяліся сыпнога тыфу. Абмяркоўвалі адно пытанне – як найбольш адчувальна нанесці шкоду акупантам.

1941 год. Кастрычнік. Збіраемся у шпіталі, спяваем савецкія песні. Так лягчэй пераносіць нярадасныя весткі з фронту, якія час ад часу ловім па прыёмніку. Выпусцілі лістоўку з заклікам да насельніцтва сабатаваць збор цёплага адзення для фашыстаў. Яе, як і іншыя лістоўкі, перапісывалі Іван Бачыла, Аляксей Бельскі, Мікалай Шкор, Фёдар Бачыла і іншыя. (Доктар) Казей і Сцяпан Бураў падклалі лістоўкі ў штабелі торфу, дзе іх знайшлі рабочыя прадпрыемства. Паліцаі ўжо не раз дапытвалі рабочых, хто ім даў лістоўкі. Аднойчы Бураў, седзячы ў канторы, як не ў чым не бывала, шчоўкаючы лічыльнікамі, прыслухаўся, што робіцца за перагародкай, і дзе знаходзіўся пакой паліцаяў. Яны ўсё намагаліся наведацца пра гэтыя праклятыя лістоўкі. Але дарэмна. Бураў і Казей дзейнічалі спрытна і асцярожна. Супакоены Бураў прыйшоў да дому. Але тут настрой яму сапсавала дачка Зоя.



- А я ведаю пра лістоўкі, - заявіла яна бацьку. – Скажы, дзе партызаны, я пайду да іх. Ці дай мне заданне…

Сцяпан глядзеў на дачку і не пазнаваў. Якой дарослай стала яна! Бураў быў высокі, хударлявы, крыху флегматычны на выгляд. Але цяпер ён ледзь спраўляўся з хваляваннем. Так можна праваліць справу. Малая ж яшчэ, як ёй даверыцца? Сцяпан Бураў прыняўся яе переконваць, адгаворвацца, што нічога не ведае. Зоя змоўкла, але па ўвартаму позірку яе бацька зразумеў, што дзяўчына не адмовілася ад свайго рашэння. Так і здарылася. Праз некалькі дзён яна са сваёй сяброўкай Дусяй правяла першую аперацыю. Калі паліцаі мыліся ў лазні, дзяўчынкі ўкралі іх зброю. Узняўся шум. Нехта сказаў, што бачыў Зою і Дусю ля лазні. Іх пацягнулі ў паліцэйскую ўправу. Але яны расплакаліся, адмаўлялі сваю віну. На першы раз сышло.

Пярэдадзень 1942 года. Колькі падзей адбылося! Чырвоная Армія паказала, што рана Гітлер святкаваў перамогу. Такога “жару”, як пад Масквой, ён ніколі не

атрымліваў. І людзі ходзяць больш бадзера. Праз нашу лістоўку яны даведаліся пра разгром гітлераўцаў пад сценамі савецкай сталіцы. Але настрой язмрочаны. Станцыя Міханавічы, веска Бардзілаўка ў жалобе. Некалькі дзён назад фашысты спалілі жывымі ў іх дамах нашых баявых таварышаў – Казея і  і **Л.А.Бачылу**.

Снежань 1942 года. Арыштавалі Зою Бураву з Дусяй. Няўрымслівыя дзяўчаты зноў надумаліся дзейнічаць самастойна. Зоя знайшла ў хаце лістоўкі і амаль адкрыта распаўсюджвала іх на вечарынцы ў Кайкаве. Дуся ёй дапамагала (Дуся – дачка летчыка, які да вайны служыў у заходняй вобласці, жыў там разам з жонкай і дачкой. Пасля нападу фашыстаў маці з Дусяй пайшлі на ўсход і знайшлі ў Кайкаве прытулак). На гэты раз дзяўчынкам не паверылі. Пасадзілі ў турму ў Мінску. Імі занялося гестапа.

Сакавік 1943 года. Што зрабілі гады з дзяўчынкамі! Марылі голадам, катавалі на допытах. На іх цяжка было глядзець. Але фашысты выпусцілі абедзьвюх. Зоя прыбегла да Бельскага, які ўжо стаў намеснікам камісара партызанскага атрада па камсамольскай рабоце. І ўсё расказала. Аказваецца, гестапаўцы зразумелі, што за спіной дзяўчынак стаіць нехта іншы. І ўвесь час спрабавалі вырваць прызнанне. Абедзьве трымаліся стойка. Тады арыштавалі Сцяпала Бурага. Ён таксама адмаўляў сваю віну. Гітлераўцы пачалі звяраць почыркі ўсіх траіх з почыркам на лістоўках. Гэта нічога не дало, бо лістоўкі пісалі іншыя. Але з гестапа не проста вырвацца. Гэтыя вылюдкі не спыняліся перад самымі вытанчанымі зверствамі. На адным з допытаў яны пачалі катаваць дзяўчат пры Сцяпане.

- Хто вам загадаў распаўсюджваць лістоўкі, хто? – злаваўся немец.
- Самі, - ледзь гучала ў адказ.

І ўсё пачыналася зноў. Не вытрамаў Сцяпан:

- Я, я загадаў.

Бураў усё ўзяў на сябе. Ні якія здзекі не прымусілі яго выдаць таварышаў. Аляксей Бельскі, які са сваёй групай адышоў у лес пасля разгрому нямецка-паліцэйскага гарнізона ў Кайкаве, забраў Зою і яе старэйшую сястру Валю ў атрад, а жонку Бурага схаваў у адной з навакольных вёсак. Дусю ж адправіў да маці ў Кайкава.

Май 1943 года. Фашысты вывезлі Сцяпана Бурага ў Трасцянец, у лагер смерці. Там ён і загінуў. Зоя ўдзельнічае ва ўсіх баявых аперацыях, помсціць за бацьку. Ад яе былой бесклапотнасці не засталося нічога. Абдумана ідзе яна ў бой. У вачах ненавісць, толькі ненавісць…

Чэрвень 1943 года. 4 чэрвеня ноччу прарывалі варожую блакаду. На досвітку ўвесь наш атрад разам з брыгадай М.Мармулёва ішоў па балоце ў напрамку пасёлка Воронічы. Ішлі праз насып былой вузкакалейкі. Расцягнуліся на 6-7 км. Ля пасёлка галава калоны натыкнулася на фашысцкі заслон. Завязаўся жорсткі бой. Імклівым ударам лясныя салдаты выбілі ворага з Вароніч. У гэты час ар’ергард толькі пераходзіў праз вузкакалейку. Пачуўшы гукі далёкага бою, партызаны з мясцовых жыхароў, якія добра ведалі кожную сцяжынку, прапанавалі пайсці па насыпу на выручку перадавым атрадам. Але насып з двух бакоў блакіравалі немцы, якія адкрылі страляніну. Нашы пайшлі ў атаку. Баец Саша Кучынскі са снайперскай вінтоўкі зняў куляметчыка. Але сілы былі вельмі няроўныя. Мінаметным і аўтаматным агнем вораг нанес партызанам значныя страты. Нашы пачалі адступаць, выносячы раненых. У гэтым баі смерцю храбрых загінула Зоя Бурава. Яе сястра Валя была паранена ў нагу. Але, сабраўшы сілы, адважная дзяўчына выцягнула з поля бою яшчэ і камандзіра роты Мітрафана Шпілявога, у яго былі прастрэляны грудзі. Партызаны адступілі ў Кайкаўскі лес. Схавалі тут Валю Бураву і Мітрафана, а самі, пастаянна мяняючы месца знаходжання, схаваліся ад карнікаў…

Пасля вайны я сустрэў Валю і Мітрафана. Яна выхадзіла яго. Ажаніліся, цяпер жывуць на станцыі Міханавічы. Памяць аб Сцяпане і Зоі Буравых для іх, як і для ўсіх нас, - незабыўная.

А. Алейнік, намеснік дырэктара лабараторыі геахімічных праблем АН БССР, былы камандзір партызанскага атрада імя Калініна.

Мінская праўда. – ад 3 верасня 1968 года. – С.4.”



**Составитель:** Камлюк, М.А.

**Редактор:** Нехай, Н.В.

**Художник- оформитель:** Камлюк, М.А.

***ГУ «Минская районная центральная библиотека»***

***Адрес:*** а/г Михановичи, ул. Школьная, 25

***Телефон:*** 515-29-72

***Время работы:***
понедельник – суббота: 10.00 – 19.00

***Выходные дни:*** воскресенье

***Санитарный день:*** первая среда месяца

***Сайт:*** https://minskaya-rcb.by/

***ВКонтакте: Минская Рцб:*** https://vk.com/id483156480

***Читайте с удовольствием!***